

УСЁ ПРА ТВАЁ АЎТО

4

ЧАМУ ВАРТА ВУЧЫЦЬ СТАРШЫНЮ СЕЛЬСАВЕТА

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

30 ВЕРАСНЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 192 (29814)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:**

*«Для вытворцаў важна аператыўна перабудоўвацца і знаходзіць свайго спажыўца. Многія ўжо правялі гэтую работу. На іх прыклады трэба раўняцца астатнім, арганізаваўшы адпаведным чынам лагістыку і схемы паставак. Такія бізнес-мадэлі, заснаваныя на пераарыентацыі экспарту і праектным інвеставанні, павысяць устойлівасць эканомікі не толькі рэгіёнаў, але і краіны ў цэлым. Са свайго боку, урад сумесна з галіновымі рэгулятарамі і мясцовай уладай працягвае выпрацоўваць і ўкараняць эфектыўныя рашэнні, як падтрымаць рэальны сектар».*

# Першы крок да Алімпу



Фота БелТА.

**Пра Спецыялізаваную дзіцяча-юнацкую школу алімпійскага рэзерву, што ў Чавусах, ведаюць далёка за межамі раёна. Тут займаюцца біятлонам 123 спартсмены ад 10 да 16 гадоў з усёй Магілёўскай вобласці. Школа абсталявана сучаснай лыжаролернай трасай і стрэльбішчам, дзякуючы чаму юныя спартсмены не толькі спасцігаюць «азы» біятлона, але і ўжо робяць першыя крокі да спартыўнага Алімпу.**

## КОРАТКА

**• Ратавальнікі з Віцебскай вобласці разгарнулі сцяг Беларусі на вяршыні Эльбруса.**



• Спецыялізаваны спінальны цэнтр створаны ў 5-й гарадской бальніцы Мінска. Паказанні для накіравання ў цэнтр — наступствы захворванняў спіннога мозгу і пазваночна-спіннамазгавой траўмы з парушэннямі функцыі тазавых органаў і з трафічнымі парушэннямі.

**• Адзіны рэестр пустых дамоў будзе сфарміраваны ў Беларусі з 1 студзеня.**

• Нацбанк Беларусі пачне ўстанаўліваць афіцыйны курс рубля да катарскага рыялу.

ISSN 1990 — 763X

22192>

По палічках

## АДНОЙ ПЕНСІІ МАЛА?

### Як назапасіць сродкі на другую, і што гарантуе дзяржава

**З 1 кастрычніка ў нашай краіне пачынае дзейнічаць механізм дадатковай накапляльнай пенсіі. Гэта значыць, працуючы грамадзянін можа рабіць адлічэнні, якія ў будучым, пры дасягненні пенсійнага ўзросту, ён атрымае ў дадатак да сваёй працоўнай пенсіі. Расказваем, хто можа ўдзельнічаць у дадзенай праграме і колькі варта адлічваць у месяц, на колькі павялічыцца пенсія і як будуць гарантаваць захаванасць сродкаў, а таксама каму дастанецца грошы ў выпадку, калі чалавек не дажыве да пенсіі.**

### Якая пенсійная сістэма дзейнічае цяпер?

У цяперашні час у Беларусі дзейнічае трохузроўневая пенсійная сістэма. Першы ўзровень, базавы, — сацыяльная пенсія. Асноўныя яе атрымальнікі — грамадзяне, якія не выпрацавалі неабходны страхавы стаж для працоўнай пенсіі. Асаблівасць сацыяльнай пенсіі ў тым, што яе выплата пачынаецца пазней ад агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту: у мужчын — у 65 гадоў, у жанчын — у 60. Яе памер дастаткова невысокі.

Другі ўзровень пенсійнага забеспячэння — традыцыйная працоўная пенсія, якую і атрымлівае большасць беларусаў. Яна выплачваецца пры дасягненні агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту (жанчынам — з 58 гадоў, мужчынам — з 63) пры ўмове, што гэтыя грамадзяне, працуючы, сфарміравалі свой страхавы стаж. Нагадаем, што страхавы стаж складаецца з перыядаў, за якія наймальнік выплачвае абавязковыя страхавыя ўзносы ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва (ФСАН).

СТАР. 3

Нашы людзі

## «Золата» кулінарнага майстэрства

**Майстар вытворчага навучання Віцебскага дзяржаўнага індустрыяльнага каледжа Алена ПОЛЕСАВА заваявала залаты медаль на міжнародным конкурсе прафмайстэрства «Майстры Шаўковага шляху», які праходзіў у Пекіне.**



Фота «Віцебскія весткі».

Алена — выпускніца каледжа і ўжо на працягу трох гадоў дапамагае навучэнцам асвойваць азы кулінарнага мастацтва. Нягледзячы на перамогі ў шматлікіх конкурсах рознага маштабу, гэтае спаборніцтва аказалася для дзяўчыны не толькі зверхадказным, але і новым.

Конкурс праходзіў дыстанцыйна: звыш 200 кухараў і кандытараў на працягу паўтары гадзіны пад прыцэлам відэакамер стваралі свае кулінарныя шэдэўры. За месяц да яго ўдзельнікі атрымалі заданні, дзе на кітайскай мове былі пазначаны інгрэдыенты. Гэта магло сыграць з кожным кулінарам злы жарт: напрыклад, «птушка» ў нас азначае розныя віды мяса — качку, індычку, а яшчэ адзін складнік стравы ў перакладзе з іерогліфаў азначаў ці то рыбу, ці то ялавічыну.

СТАР. 4

# НЕ ПРОСТА МОСТ ДРУЖБЫ

**У гістарычных мясцінах паўночна-ўсходняга ўзбярэжжа Чорнага мора пабываў 28 верасня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка**

**Таксама адбылася сустрэча на абхазскай зямлі. З Асланам Бжанія кіраўнік беларускай дзяржавы абмеркаваў эканамічныя праекты, перспектыўныя пытанні супрацоўніцтва Беларусі і Абхазіі, паведамляе БелТА.**

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што напярэдадні абмяркоўваў праблемы Абхазіі з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. «Мы шмат вельмі, да ночы абмяркоўвалі гэтыя пытанні. Ён вельмі паглыблены, больш чым я, у праблемы і справы Абхазіі. Не буду доўга гаварыць аб гэтым, але мы прыйшлі да адной высновы: што Абхазія ёсць, яе з карты не сцерці, ніякія санкцыі не змогуць гэта зрабіць. Абхазію, як ён гаворыць, нельга кідаць, трэба дапамагаць. Каб гэты квітнеючы край і тыя людзі, якія тут жывуць, жылі нармальна», — заявіў беларускі лідар.

Ён падкрэсліў, што прыехаў не таму, што «нейкая сітуацыя склалася». «У нас нармальная сітуацыя. Мы проста хочам, як і вы, мірны, добры, працавіты народ, жыць у згодзе», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, эканоміка, гандлёва-эканамічныя сувязі павінны стаць падмуркам адносін. «Мы прыехалі з дабром. І калі нечым вам можам дапамагчы, прытым калі супрацоўніцтва ўзаемавыгаднае, мы гэта зробім. Пагаворым шмат аб чым. Я чалавек, як вы ведаеце, ужо вопытны. І ў палітыцы, і ў іншых сферах. Пагаворым, падумаем, як нам жыць далей. Галоўнае, каб тут народ жыў дастойна. Таму што гэты райскі куток нашай зямлі такога заслугоўвае. А людзі тут святыя. Не дзеля лісліваcці вам кажу: святыя! Я гэта помню з савецкіх часоў, калі тут быў. Таму мы хочам наладзіць гэты не проста мост дружбы, а вельмі сур'ёзныя нашы адносіны», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Праблемы і рашэнні

# Безгаспадарчай зямля быць не можа

## Падчас прыёмаў грамадзян губернатарамі Мінскай і Гродзенскай абласцей дамінавала «зямельная» тэма

**Старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН правёў асабісты прыём грамадзян. Да яго звярнуліся шэсць заяўнікаў. Першай зайшла Марына Пічурына з аграгарадка Хацежына Мінскага раёна, якая пражывае ў доме № 13 па вуліцы Міра.**



Жанчына расказала, што шматкватэрнаму дому ўжо 50 гадоў. І, вядома, тут даўно патрабаваўся капітальны рамонт. Нарэшце жыльцы дачакаліся. Згодна з праектна-каштарыснай дакументацыяй, у будынку планавалі замяніць каналізацыйныя трубы, сістэму ацяплення, радыятары ў кватэрах, дах, абнавіць фасады, умацаваць балконы. Летась восенню будаўнікі зрабілі дах. Аднак, як толькі пачаліся дажджы, ён пачаў працякаць — літаральна праз два месяцы. Рамонт сістэмы ацяплення будаўнікі не давялі да канца. Куды толькі ні тэлефанавала заяўніца з просьбай закончыць пачатае, яе ніхто не пачуў.

Хвалюючь жанчыну і іншыя пытанні жыцця аграгарадка. Не так даўно ў Хацежыне адкрылі новую амбулаторыю. На адным з папярэдніх прыёмаў грамадзян да Аляксандра Турчына звярнулася жанчына з гэтага населенага пункта. Яна расказала, што жыхарам даводзіцца ездзіць у Мінск, каб здаць аналізы. У амбулаторыі паставілі гематалагічны апарат, але пазней аддалі іншай медыцынскай установе. Цяпер лабарант вымушаны рабіць аналізы з дапамогай мікраскопа. Няма гарантыі, што вынікі даследавання дакладныя і якасныя.

У дрэнным стане знаходзіцца і ўказальнік на ўездзе ў Хацежына. Акрамя таго, бацькі незадаволеныя і работай дзіцячага садка, кіраўніцтва якога пастаянна просіць скінуцца на швабры, вёдры і іншы інвентар.

Што датычыцца сістэмы ацяплення, старшыня Мінскага райвыканкама Уладзімір Юргевіч запэўніў, што яе наладзяць на працягу некалькіх тыдняў. А вось пытанне з газам больш складанае, пакуль жыльцам давядзецца карыстацца для прыгатавання ежы электрапліткамі.

Аляксандр Турчын даручыў прадпрыемству «Мінскаблгаз» закончыць усе работы ў максімальна кароткі перыяд. «А Хацежынская амбулаторыя павінна мець тое абсталяванне, якое ёй выдзелена. Знак таксама будзе заменены. Возьмем на кантроль і пытанне па дзіцячым садку», — падкрэсліў ён.

Мінчанін Яўген Шагун валодае зямельным участкам у садовым таварыстве «Сонечнае-2010» Уздзенскага раёна, які пастаянна затапляецца. З такой праблемай сутыкнуліся і іншыя ўладальнікі ўчасткаў, і нават суседнія таварыствы. Справа ў тым, што ў 80-х гадах мінулага стагоддзя на гэтым месцы вучоныя выявілі залежы торфу. Пачалася яго здабыча. Праз два гады прыродныя багацці былі цалкам выбраны, і зямельныя ўчасткі раздалі людзям.

На працягу дваццаці гадоў яны апрацоўвалі зямлю і не ведалі гора. А затым меліярацыйныя каналы, якія пралягаюць побач з участкамі, зараслі. І калі раней вада ў іх была на паўтара метра ніжэй ад лініі берагоў, то цяпер яе ўзровень падняўся. Кожную восень і вясну ўчасткі ператураюцца ў «рысавыя» палі.

Многія ўладальнікі ўсур'ёз задумваюцца прадаць свае надзелы, нават за бясцэнак. Звярталіся яны ў сельсавет, райвыканкам, прадпрыемства меліярацыйных сістэм, але праблема не вырашаецца. У 2019 годзе быў зроблены праект ачысткі каналаў. Здавалася, фініш блізка. Але на шляху да мэты з'явілася перашкода — аказалася, што гэтая зямля не стаіць на балансе ні арганізацыі, ні прадпрыемства. Яна проста «нічыйная».

Аляксандр Турчын даў даручэнне адпаведным службам прачысціць каналы. Генеральны дырэктар Мінскага дзяржаўнага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання Яўген Крыскевіч адзначыў, што гэта будзе лічыцца нямэтавым расходаваннем сродкаў.

— Пасля выканання праектна-каштарыснай дакументацыі, выдалення дрэў і хмызняку будзе відаць, колькі каштуе ачыстка каналаў. Суму падзелім паміж меліяратарамі і леснікамі. На працягу кастрычніка работы неабходна завяршыць, — рэзюмаваў Аляксандр Турчын.

Жыхар Валожынскага раёна Юрый Кавальчук паскардзіўся на дрэнную якасць дарогі паміж вёскамі Саланая і Бурнейкі, а таксама ў саміх Бурнейках.

— Замест таго каб зрабіць якасны рамонт дарогі, яе «чэшуць» грэйдарамі, ды так, што ўжо да гліны дайшлі. А пасля чарговага дажджу яна ператвараецца ў балота. З-за дрэннай дарогі ў населены пункт не можа заехаць аўталаўка. Аднойчы ўсёй вёскай давялося штурхаць машыну. У мяне бацька гіпертонік. Але хуткая дапамога загразла на гэтай дарозе. Урачу давялося дабірацца да хворага пешшу.

Аляксандр Турчын даручыў у хуткім часе зрабіць нармальную гравійку, пасля чаго правесці яе маніторынг: як пакажа сябе восенню. «Аўталаўка і «хуткая» павінны хадзіць спраўна», — дадаў ён.

Незадаволены станам дарогі паміж вёскамі Слабодка і Праходка і жыхар Мінска Ігар Жук: «Падчас дажджоў, вясновай паводкі сюды не ходзяць аўтобусы, аўталаўкі. Дзесяць гадоў мясцовыя жыхары просяць уладкаваць дарогу, пакласці асфальт. І раней нам гэта абяцалі».

— Вы ведаеце мае адносіны да абяцанняў. Калі людзям сказана, што дарогу ўпарадкуюць, трэба трымаць слова, няважна, хто яго даваў, — звярнуўся Аляксандр Турчын да генеральнага дырэктара прадпрыемства «Мінскаблдарбуд» Віктара Рагускага. — Дарогу неабходна прывесці ў парадак паэтапна. Спачатку зрабіць рамонт найбольш праблемных участкаў. Магчыма, гэтага будзе дастаткова. Калі не, работы працягнем.

Усхваляваны прыйшоў на прыём старшыня Старадарожскага сельвыканкама Уладзімір Бода. На яго завялі крымінальную справу за тое, што ў вёсцы Шапчыцы былі ссечаны дрэвы і кусты каля вадаёма.

Як расказаў заяўнік, раней тут была зона адпачынку. З цягам часу возера пачало засмечвацца, берагі зараслі хмызняком і старымі дрэвамі. Акрамя таго, тут з'явіўся «могільнік» няспраўнай бытавой тэхнікі, якую выкідвалі людзі. «Да мяне звярнуліся землякі з просьбай навесці там парадак. Было прынята рашэнне прыбраць звалку, дрэвы і кусты. Гэтым займалася адно з прадпрыемстваў. Але яно не дачакалася адпаведнага дазволу на правядзенне работ, каб усё было па законе. Ужо паўгода доўжыцца следства. Але я не магу зразумець, у чым вінаваты», — здзіўляецца заяўнік.

Разам з тым старшыня Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Кацярына Паляшчук запярэчыла Уладзіміру Бодзе. Па падліках спецыялістаў, у населеным пункце было зрэзана больш як 240 ліcцевых і пладовых дрэў.

— Адзінае, што я магу зрабіць, — звярнуўся да кіраўніка Мінскага абласнога ўпраўлення Следчага камітэта, каб хутчэй завяршыць расследаванне справы, — паабяцаў старшыні сельвыканкама Аляксандр Турчын.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

* * *

**Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК правёў асабісты прыём грамадзян у Іўеўскім раёне. Са сваімі праблемамі да кіраўніка рэгіёна звярнуліся трое жыхароў Іўя. Адно з пытанняў датычылася карыстання «нічыйным» зямельным участкам.**



Уладзімір Каранік патлумачыў, што безгаспадарчай зямлі не бывае. Яна, у тым ліку, выдзяляецца для абслугоўвання камунікацый і дзяржаўных патрэб. Але некаторыя трактуюць гэта вельмі вольна. Маўляў, ёсць незаняты ўчастак — чаму б ім не скарыстацца? Між тым зямля — гэта асноўны рэсурс, які павінен знаходзіцца пад кантролем дзяржавы. Гэта, у сваю чаргу, не выключае права карыстацца зямлёй. Больш за тое, новы зямельны кодэкс пашырыў магчымасці людзям атрымаць зямлю ў карыстанне для будаўніцтва жылля ці вядзення асабістай гаспадаркі.

— Большасць людзей такія новаўвядзенні падтрымалі, пачалі імі актыўна карыстацца, — заўважыў кіраўнік рэгіёна. — Але ўсё роўна знаходзяцца тыя, хто блытае лібералізацыю і ўсёдазволенасць. Тое, што адбылося зараз, — лібералізацыя. Аднак зямельныя адносіны заўсёды былі, ёсць і будуць пад жорсткім кантролем дзяржавы. Дзякуючы кодэксу мы максімальна палегчылі магчымасць атрымаць зямлю людзям, якія маюць права і хочуць працаваць на зямлі.

Таксама падчас прыёму да губернатара звярнуліся з асабістай просьбай, якая датычылася медыцынскай сферы. Як вядома, Уладзімір Каранік — прафесійны медык, да паста губернатара быў міністрам аховы здароўя Беларусі.

— Медыцына мяне ніколі не адпусціць. Людзі звяртаюцца па кансультацыю, і ў дадзеным выпадку прыемна, што камусьці скараціў шлях, каб атрымаць якасную медыцынскую дапамогу, — зазначыў старшыня аблвыканкама.

Што датычыцца зваротаў, па словах Уладзіміра Караніка, іх колькасць пастаянна памяншаецца. Як тых, што паступаюць на ўзровень вобласці, так і ў вышэйшыя інстанцыі — і на гарачыя тэлефонныя лініі, і на асабістыя прыёмы. Значную ролю ў гэтым адыгрывае служба «Адно акно» сумесна з работай мясцовых органаў улады, калі яны падыходзяць да сваіх абавязкаў нефармальна.

— Служба «Адно акно» адцягнула на сябе львіную долю зваротаў, — падкрэсліў губернатар. — Добра, калі чалавек можа прыйсці ў адно месца, дзе будуць дадзены ўсе даведкі, атрымана кансультацыя. Тады няма неабходнасці хадзіць па розных кабінетах. Ёсць магчымасць атрымаць поўную карціну сітуацыі на месцы.

Старшыня аблвыканкама звярнуў увагу і на змяншэнне паўторных зваротаў. Гэта, на яго думку, адбываецца не таму, што людзі не бачаць перспектыў звяртацца да прадстаўнікоў дзяржаўных органаў, а таму, што большая частка пытанняў, з якімі людзі раней выходзілі на абласны ўзровень, вырашаецца раённымі органамі ўлады.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Блізкая ўлада

# Выканкамы на сувязі

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 1 кастрычніка, з 9.00 да 12.00 правядуць:**

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васільевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Васільевіч УЛАСЕВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Дзяніс Мікалаевіч КУРЛЕНКА. Тэл. 8 017 500 41 60;
- першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Дзмітрый Міхайлавіч МІКУЛЁНАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

# АДНОЙ ПЕНСІІ МАЛА?



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Для грамадзян, якія выходзяць на пенсію сёлета, страхавы стаж мусіць складаць 18,5 года. Штогадова ён павялічваецца на шэсць месяцаў да дасягнення 20 гадоў у 2025 годзе. Памер працоўнай пенсіі непасрэдна залежыць ад удзелу грамадзяніна ў яе фарміраванні. Як правіла, на гэта ўплывае працягласць работы, а таксама памер заробку, з якога выплачваліся ўзносы ў ФСАН. Паводле слоў **першага намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Наталлі ПАЎЛЮЧЭНКІ**, працоўная пенсія па ўзросце непрацуючага пенсіянера на верасень гэтага года складае каля 640 рублёў.

Трэці ўзровень — добраахвотнае пенсіённае страхаванне. Да 1 кастрычніка гэта цалкам камерцыйны від страхавання, які ажыццяўляецца шэрагам страхавых кампаній са сродкаў грамадзян ці іх наймальнікаў.

## Што зменіцца з 1 кастрычніка?

З гэтай даты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны сумесна з Міністэрствам фінансаў запускаюць новы для нашай краіны від — добраахвотнае страхаванне накапляльнай пенсіі. Яно ўводзіцца ў адпаведнасці з Указам кіраўніка дзяржавы ад 27 верасня 2021 года. Яго нормы прадугледжваюць фарміраванне дадатковай пенсіі з удзелам дзяржавы.

## Хто можа ўдзельнічаць у праграме?

Права на ўдзел у добраахвотным страхаванні накапляльнай пенсіі даецца ўсім працуючым грамадзянам, за якіх іх наймальнікі выплачваюць страхавыя ўзносы ў ФСАН на абавязковае пенсіённае страхаванне і якім да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту засталося не менш за тры гады. Важна, што работадавец удзельніка не павінен знаходзіцца ў стане ліквідацыі, эканамічнай неплацежаздольнасці, банкруцтва.

## Як і дзе заключыць дагавор?

Страхаванне і далейшую выплату пенсіі ажыццяўляе дзяржаўнае прадпрыемства «Стравіта». Для гэтага паміж працуючым грамадзянінам і прадпрыемствам «Стравіта» мусіць быць заключаны дагавор. Падчас яго афармлення трэба выбраць тарыф страхавання і перыяд атрымання пенсіі.

Такім чынам, на стадыі заключэння дагавора варта вызначыцца з працягласцю атрымання такой пенсіі (а гэта пяць ці дзесяць гадоў з моманту наступлення агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту). І тарыфам страхавання (гэта сумарны працэнт адлічэнняў работніка і работадаўца), які можа быць не больш за 13 %. Пра яго падрабязней раскажам далей.

Такім чынам, з 1 кастрычніка грамадзянін можа заключыць дагавор — або непасрэдна звярнуўшыся ў офіс прадпрыемства «Стравіта», або праз асабісты кабінет карыстальніка на афіцыйным сайце «Стравіта», прайшоўшы рэгістрацыю.

## Колькі варта адлічваць з заробку?

На накапленне дадатковай пенсіі працуючы грамадзянін накіроўвае пэўны працэнт ад сваёй заробатнай платы — ад 1 да 10 %. Роўны працэнт, але не больш за тры працэнты, накіроўвае яго работадавец. Калі работнік адлічвае 1 %, то і работадавец 1 %, калі 2 %, то і работадавец 2 %, калі ж работнік адлічвае ад 3 да 10 %, то работадавец адлічвае 3 % (з гэтага і складаецца тарыф страхавання). Такім чынам фарміруецца пул фінансавых сродкаў для назапашвання. Пры гэтым затрачаныя сродкі работадаўца кампенсуе бюджэт ФСАН, і работадаўцы не нясуць дадатковай фінансавай нагрузкі.

## Ці можна мяняць працэнт адлічэнняў?

Са «Стравітай» заключаецца адзін дагавор без права яго далейшага скасавання. Ён дзейнічае да агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту. Па жаданні застрахаванай асобы тарыфы ўзносаў (працэнт, які адлічваеце) можна мяняць штогод.

## Што рабіць, калі страцілі работу і не можаце адлічваць сродкі?

У рамках дзеяння дагавора на любым этапе можна прыпыніць свой удзел у сістэме і гэтак жа аднавіць яго зноў. Пры гэтым раней унесеныя страхавыя ўзносы працягваюць працаваць, капіталізавацца і пры дасягненні агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту будуць выплачаны. Таксама работніку даецца льгота пры вылічэнні падаходнага падатку на суму, якую ўтрымліваюць з яго заробку для пералічэння ў «Стравіту».

## Калі застрахаваны не дажыў да пенсіі?

Выплата накапляльнай пенсіі адбываецца роўнымі долямі на працягу пяці ці дзесяці гадоў. Яна можа перадавацца ў спадчыну. Калі чалавек памірае падчас дзеяння дагавора страхавання ў перыяд накаплення, яго спадчыннікі атрымліваюць грашовыя сродкі, назапашаныя на імянным асабовым рахунку. Калі смерць страхавальніка наступае на стадыі атрымання дадатковай накапляльнай пенсіі, тады яго спадчыннікі атрымаюць тыя грашовыя сродкі, якія ім яшчэ не атрыманы і захоўваюцца на яго імянным асабовым рахунку.

## Ці можна вярнуць грошы датэрмінова?

Вярнуць грошы датэрмінова можна пры наступленні інваліднасці I ці II групы. Аднаразовым плацяжом усе назапашаныя сродкі будуць выплачаны.

## Як будуць узаемадзейнічаць усе ўдзельнікі сістэмы?

У новай сістэме можна вылучыць два блокі ўдзельнікаў: прамыя і ўскосныя. Прамыя ўдзельнікі — сам працуючы грамадзянін і прадпрыемства «Стравіта». Ускосныя — работадавец і ФСАН. Прамыя ўдзельнікі заключаюць паміж сабой дагавор і выконваюць яго абавязацельствы. Ускосныя ўдзельнікі выконваюць наступныя функцыі: работадавец пералічвае сродкі і прадастаўляе інфармацыю аб пералічаных сумах з разбіўкай па грамадзянах, якія ў яго працуюць, у прадпрыемства «Стравіта». А ФСАН кампенсуе затрачаныя работадаўцам сродкі шляхам зніжэння памеру ўзносаў у бюджэт фонду за работнікаў, якія ўдзельнічаюць у накапленні дадатковай пенсіі.

Работадавец будзе абменьвацца інфармацыяй са «Стравітай» шляхам дзяржаўнай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы. А адносна ФСАН для работадаўцаў нічога не зменіцца — для іх сувязным звяном застанецца карпаратыўны партал фонду.

## Ці трэба інфармаваць работадаўца?

Важная ўмова, якой неабходна прытрымлівацца грамадзяніну пасля заключэння дагавора страхавання, — праінфармаваць свайго работадаўца. «На рабоце трэба напісаць заяву аб вылічэнні з заработнай платы страхавога ўзносу, які будзе выплачвацца за кошт сродкаў грамадзяніна, і прадставіць копію страхавога пасведчання з прад'яўленнем яго арыгінала. Пакуль работнік гэтага не зробіць, сістэма не запрацуе, нягледзячы на тое, што маецца дагавор страхавання», — тлумачыць **намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення страхавога нагляду Міністэрства фінансаў Наталля НОВІКАВА**.

Пры змене работы таксама варта ў абавязковым парадку праінфармаваць новага наймальніка, што вы ўдзельнічаеце ў сістэме дадатковай накапляльнай пенсіі.

## Чаму «Стравіта»?

Гэта адна з найбуйнейшых страхавых арганізацый Беларусі. Паводле слоў **генеральнага дырэктара дзяржаўнага прадпрыемства «Стравіта» Сяргея АНДРЫЕВІЧА**, сёння яно займае 70 % рынку страхавання жыцця і дадатковай пенсіі, а актывы кампаніі набліжаюцца да мільярда рублёў. Гэта страхавыя рэзервы, якія сфарміраваны па існуючых дагаворах страхавання жыцця і дадатковай пенсіі. Для гарантавання выканання абавязацельстваў ёю будуць працягваць фарміравацца рэзервы і гарантыйны фонд.

Выплаты па дагаворах страхавання, заключаных з дзяржаўнай страхавой арганізацыяй, гарантуюцца дзяржавай. «Аб надзейнасці можна казаць з вялікай імавернасцю. Нам 20 гадоў, і пакуль мы ўсе свае абавязацельствы выконваем у поўным аб'ёме», — кажа Сяргей Андрыевіч.

Пакуль прыцягненне іншых страхавых арганізацый у новую сістэму не плануецца.

## Як будуць працаваць пералічаныя «Стравіце» грошы?

Сфарміраваныя падчас страхавання рэзервы будуць размяшчацца ў фінансавыя інструменты, якія вызначаюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам. Гэта дзяржаўныя каштоўныя паперы, аблігацыі, а таксама ўклады ў дзяржаўных банках. Адпаведна, грашовыя сродкі будуць пастаянна працаваць і фарміраваць даходнасць. А яна будзе размяркоўвацца паміж асабовымі рахункамі застрахаваных грамадзян.

## Ці не абясцэняцца сродкі?

На сёння вызначана гарантаваная даходнасць сродкаў у памеры стаўкі рэфінансавання. Калі яна будзе мяняцца, мяняцца будзе і гарантаваная даходнасць на кожным асабовым рахунку. Акрамя таго, у выпадку атрымання дадатковага даходу ад размяшчэння грашовых сродкаў не менш за 50 % ад яго сумы таксама будзе размяркоўвацца паміж застрахаванымі.

Дадатковыя інструменты захавання сродкаў прапрацоўваюцца з беларускімі банкамі. Пад прыведзены ўказ будуць адкрыты дэпазіты з пэўнымі ўмовамі, якія дазволяць забяспечваць тую даходнасць, якая сёння прадугледжана ўказам.

Страхаванне прадугледжана толькі ў беларускіх рублях.

## Наколькі большую пенсію можна атрымаць?

Пры зарплаце ў 1400 рублёў і фармаце «тры+тры працэнты» пры стаўцы рэфінансавання 12 %, за 10 гадоў накаплення атрымаецца дадатковая штомесячная пенсія каля 300 рублёў — калі яе атрымліваць плануеце на працягу пяці гадоў, і 145 рублёў — на працягу 10 гадоў. Калі назапашваць 20 гадоў, то, адпаведна, 1200 у месяц на працягу пяці гадоў і 600 у месяц — на працягу 10 гадоў.

## Які тарыф самы запатрабаваны?

Спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны сумесна з прадстаўнікамі «Стравіты» правялі больш за сем тысяч сустрэч у працоўных калектывах і на дыялогавых пляцоўках, дзе паразмаўлялі з мільёнам грамадзян. Лічыцца, што найбольш запатрабаваным будзе фармат «тры+тры працэнты». Спецыялісты хацелі б бачыць у сістэме больш маладых людзей, каб стваралася культура фарміравання сваёй пенсіённай будучыні. Пакуль жа цікавасць ёсць у асоб сярэдняга і старэйшага ўзросту, расказала Наталля Паўлючэнка.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Вялікабрытаніі заявілі, што цяперашні прэм'ер з'яўляецца пагрозай для эканомікі краіны



Кіраўнік апазіцыйнай Лейбарысцкай партыі Вялікабрытаніі Кір Стармер заявіў, што цяперашні прэм'ер-міністр краіны Ліз Трас уяўляе пагрозу для нацыянальнай эканомікі. Аб гэтым паведаміла РІА «Навіны» са спасылкай на брытанскі тэлеканал Skynews. У прыватнасці, Стармер раскрытыкаваў новага прэм'ера Вялікабрытаніі Ліз Трас і канцлера казначэйства Квазі Квартэнга за ўвасобленыя імі «план падтрымкі», пасля якога ў Брытаніі пачаўся сапраўдны эканамічны шторм. Палітык зазначыў, што Трас страціла кантроль над сітуацыяй. Паводле яго слоў, урад «гуляе на грошы» простых грамадзян, каб даць падатковыя льготы вельмі багатым.

### У Фларыдзе два мільёны чалавек засталіся без святла з-за ўрагану «Іэн»



Каля 20 працэнтаў усіх зарэгістраваных спажыўцоў электраэнергіі ў штаце засталіся без святла. Аб гэтым сведчаць звесткі партала Poweroutage.com, які агрэгуе даныя сеткавых кампаній у Паўночнай Амерыцы. «Іэн» абрынуўся на паўднёва-заходняе ўзбярэжжа Фларыды ў сераду. Паводле ацэнак нацыянальнага цэнтра ЗША па назіранні за ўраганамі, на піку гэта быў «вельмі небяспечным ураган чацвёртай катэгорыі». Максімальная хуткасць ветру ўнутры яго перавышала 240 кіламетраў за гадзіну. Больш за 2,5 мільёна чалавек у Фларыдзе падлягалі абавязковай эвакуацыі. Амерыканскія СМІ адзначалі, што ўраган «Іэн» супастаўны з наймацнейшым штормам, які калі-небудзь абвальваўся на заходняе ўзбярэжжа Фларыды. Хуткасць парываў ветру была аналагічная той, якую зафіксавалі падчас урагану «Чарлі» ў 2004 годзе. Раней «Іэн» прайшоў праз заходнюю частку Кубы, узмацніўшыся да максімальнай пятай катэгорыі па шкале Сафіра-Сімпсана. Пасля ўдару стыхіі карыбскі востраў аказаўся цалкам абясточаны.

### Энергакрызіс можа прывесці да перабояў з мабільнай сувяззю ў ЕС



Кіраўнікі чатырох еўрапейскіх тэлекамунікацыйных кампаній паведамілі Reuters, што яны чакаюць цяжкай зімы. Па словах суразмоўцаў, гэты сезон стане праверкай на трываласць, прымушаючы кампаніі і ўрады шукаць шляхі пераадолення дэфіцыту энергарэсурсаў з-за праблем з пастаўкамі расійскага газу. Эксперты адзначылі, што зараз у многіх еўрапейскіх краінах не хапае рэзервовых сістэм, якія б дазволілі пры неабходнасці справіцца з маштабнымі адключэннямі электрычнасці. Гэта павялічвае рызыкі перабояў у рабоце сотавай сувязі. Таму апаратары вымушаны будуць змяншыць спажыванне электраэнергіі і мадэрнізаваць сваё абсталяванне, выкарыстоўваючы больш энергаэфектыўныя мадэлі прыёмнікаў.

Лічбавы беларус

# Марка, страхоўка, знаходжанне ў вышуку

## Як атрымаць звесткі пра аўтамабіль — свой і чужы — з чатырох крыніц адразу

**Даведацца пра марку, нумар, наяўнасць страхоўкі і тэхагляду аўто, а таксама праверыць, ці не знаходзіцца машына ў вышуку, цяпер можна праз асабісты кабінет на Адзіным партале электронных паслуг. І гэта далёка не поўны пералік магчымасцяў паслугі 3.58.01 «Атрыманне сістэматызаваных звестак пра аўто», дзякуючы якой, ведаючы толькі VIN-нумар машыны і зрабіўшы толькі адзін запыт, можна атрымаць звесткі пра аўто з чатырох інфармацыйных рэсурсаў: ДАІ, Белтэхагляду, Беларускага бюро па транспартным страхаванні і інфармацыйнай сістэмы транспартных сродкаў, якія адшукваюцца. Пра асаблівасці і планы далейшага развіцця комплекснай паслугі расказаў Андрэй БУСЬКО, вядучы спецыяліст аддзела электроннай камерцыі Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг (НЦЭП).**



### ДЛЯ ЗРУЧНАСЦІ І КОЛЬКАСЦІ

Паслугу ў рэжыме рэальнага часу можа атрымаць абсалютна кожны: юрыдычныя і фізічныя асобы, а таксама індывідуальныя прадпрымальнікі. Праверыць даныя можна як пра сваё аўто, так і пра любое іншае. Ніякіх персанальных звестак пра ўладальніка транспартнага сродку паслуга не ўтрымлівае — падаюцца толькі даныя пра машыну. Пры гэтым незалежна ад спосабу ўваходу на партал — строгай аўтэнтыфікацыі (з выкарыстаннем электроннага лічбавага подпісу, або ЭЛП) ці нястрогай (з выкарыстаннем толькі лагіна і пароля) чалавек атрымае абсалютна аднолькавы склад звестак, расказаў Андрэй Бусько:

— Гэта зроблена спецыяльна, каб паслуга была зручнай. Зразумела, што заказваць электронны лічбавы подпіс і аплачваць яго атрыманне дзеля таго, каб даведацца даныя аўтамабіля, мала хто захоча. А ўласны ЭЛП ёсць пакуль далёка не ва ўсіх. Акрамя таго, мы мелі на мэце заахвоціць людзей больш карыстацца паслугай і пры гэтым шырэй распаўсюдзіць інфармацыю пра яе існаванне. З моманту з'яўлення паслугі на пачатку жніўня ёй скарысталіся ўжо каля паўтары тысячы чалавек.

Спецыялісты цэнтра падкрэсліваюць, што другая комплексная паслуга на адзіным партале (першай і адзінай дагэтуль была комплексная паслуга «Звесткі для праверкі добранадзейнасці дзелавой рэпутацыі», якая дазваляе атрымаць інфармацыю аб кампаніі ажно па 12 напрамках) скіравана найперш на фізічную асобу, якой даецца магчымасць атрымліваць і правяраць звесткі пра аўто значна аператыўней і ў большай колькасці. «Для людзей гэта эканомія часу, адсутнасць неабходнасці хадзіць па ўстановах, высвятляючы пэўныя абставіны гісторыі жыцця транспартнага сродку. Як вынік, гэта магло паспрыяць і большай колькасці заключаных здзелак куплі-продажу», — мяркуюць эксперты.

### УСЁ — ПРА АЎТО...

Паслуга 3.58.01 акумулюе даныя пра машыну на падставе інфармацыі з чатырох крыніц, таму праз адзін запыт можна атрымаць шмат інфармацыі.

Так, у асабісты кабінет карыстальніка дашлюць сістэматызаваныя звесткі пра транспартны сродак: яго рэгістрацыйны нумар, марку, год выпуску, тып кузава, вагу, максімальна дазволеную вагу, серыю, нумар і дату выдачы пасведчання аб рэгістрацыі, дату завяршэння тэрміну дзеяння пасведчання аб рэгістрацыі, звесткі пра вышук аўто (на тэрыторыі СНД).

Прыйдзе таксама інфармацыя, якая датычыцца звестак дагавора страхавання: серыя і нумар дагавора страхавання; найменне арганізацыі, якая заключыла дагавор страхавання; дата пачатку і завяршэння дзеяння дагавора.

Карыстальнік комплекснай паслугі «Атрыманне сістэматызаваных звестак пра аўто» атрымае доступ і да дыягнастычных звестак пра машыну: дата апошняга праходжання кантрольна-дыягнастычных работ (КДР); серыя і нумар дыягнастычнай карткі (пры яе наяўнасці); паказанні адометра, якія былі зафіксаваны падчас правядзення КДР; дата выдачы, серыя і нумар дазволу; прымяненне транспартнага сродку (ці не з'яўляецца машына таксі); тэрмін дзеяння дазволу.

### РАМОНТ, ПРАБЕГ, АДКАЗНАСЦЬ...

Цяпер паслуга «Атрыманне сістэматызаваных звестак пра аўто» каштуе 3,36 рубля. З павелічэннем колькасці інфармацыі з іншых рэсурсаў кошт таксама будзе павялічвацца.

— Задача НЦЭП — быць пасрэднікам паміж карыстальнікам (трансліраваць яго запыт да патрэбнай сістэмы) і аператарам — уладальнікам інфармацыйнай сістэмы (трансліраваць яго адказ у асабісты кабінет карыстальніка), — падкрэсліў Андрэй Бусько. — Спецыялісты цэнтра не адказваюць за склад, аб'ём і праўдзівасць даных, якія карыстальнік атрымлівае ад той ці іншай інфармацыйнай сістэмы. А вось ужо **суб'екты гэтых сістэм, якія адказваюць за фарміраванне дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў, карыстанне і атрыманне дакументаванай інфармацыі з іх, абавязаны даць аб'ектыўныя і праўдзівыя звесткі з дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў і несці адказнасць за сапраўднасць і паўнату інфармацыі, якая ўключаецца ў гэтыя рэсурсы.**

Спецыялісты цэнтра звяртаюць увагу карыстальнікаў паслугі, якія запытваюць звесткі пра пэўнае аўто, што, напрыклад, праверыць, ці адпавядае рэчаіснасці інфармацыя аб прабегу аўто, пакуль немагчыма. Для дакладнай фіксацыі гэтага паказчыка было б добра мець усю гісторыю прабегу аўтамабіля, якая захоўвалася б і плюсавалася падчас чарговых праходжанняў тэхагляду транспартным сродкам, лічаць у цэнтры.

Немагчыма таксама дакладна праверыць, ці з'яўлялася машына таксі. Калі чалавек рэгіструецца ў сучасных анлайн-сэрвісах па перавозцы пасажыраў, накшталт «Убер» ці «Яндэкс-таксі», і пампуе адпаведны мабільны дадатак на тэлефон, то звесткі пра гэта нідзе не фіксуюцца. Адпаведна, такія даныя несумленны ўладальнік можа прыхаваць, папярэдзілі ў цэнтры.

На будучыню спецыялісты НЦЭП мяркуюць павялічваць колькасць інфармацыйных рэсурсаў, з якіх можна атрымліваць звесткі пра аўто, якія будуць цікавыя і карысныя для спажыўца, паведаміў Андрэй Бусько:

— Як паказала практыка, карыстальнікам вельмі важна ведаць пра пашкоджанні аўто і іх удзел у дарожна-транспартных здарэннях, таму прапрацоўваецца пытанне з МУС, каб такую інфармацыю таксама даваць у пакеце звестак паслугі «Атрыманне сістэматызаваных звестак пра аўто».

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**




# «Золата» кулінарнага майстэрства

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Кухару з Віцебска прыйшлося звяртацца па дапамогу да лінгвіста, а яшчэ яна адточвала тэхналогію прыгатавання конкурсных страў па пяць разоў. Аднак з усімі цяжкасцямі майстар справілася, 90 хвілін прайшлі без эксцэсаў і прынеслі нечаканую перамогу.



У складзе нацыянальнай каманды Алена праходзіла дыстанцыйны этап у Магілёве на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта харчовых і хімічных тэхналогій. На суд міжнароднага журы дзяўчына прадставіла дзве стравы: курыны фаршыраваны рулет, звараны па тэхналогіі су-від (тэхналогія прыгатавання ў вакуумнай упакоўцы) і гарачую страву з белай рыбы — сібаса. На гарнір — гародніна, розныя соусы, ажурныя чыпсы з цеста (асабістая распрацоўка маладога майстра) і нават пыл з мікразялёніва. Па словах Алены, класнай «фішкай» гэтага прафесійнага спаборніцтва была ўмова прыгатаваць страву з мінімальнымі адходамі. Гэта не толькі аптымізуе рабочы працэс, але і падштурхоўвае да самых незвычайных ідэй. Менавіта таму мікрагрын ператварыўся ў натуральнае каляровае ўпрыгажэнне.

Каманда суддзяў ацэньвала стравы па некалькіх крытэрыях. Перш за ўсё яны звярталі ўвагу на падачу, правяралі, ці выканана тэхналогія прыгатавання, ці адпавядае страва меню, вымяралі тэмпературу і масу, ацэньвалі арганізацыю работы. За ўсімі падрыхтоўкамі эксперты сачылі анлайн дзякуючы тром камерам, размешчаным на рабочым месцы.

На высокі вынік Алена не разлічвала — занадта жорсткай была канкурэнцыя. Аднак амаль праз месяц на фінальнай трансляцыі, якая праходзіла на кітайскай мове, падчас аб'яўлення пераможцаў у розных намінацыях майстар пачула прозвішча, падобнае да яе. Яшчэ праз месяц у Віцебск прыйшлі заслужаныя ўзнагароды — залаты медаль і дыплом. А таксама — запрашэнне на асабісты ўдзел, калі палепшыцца эпідэмічная сітуацыя.

«Дасягнуць вышыні на конкурсе такога ўзроўню вельмі прыемна. Гэта не паказчык таго, што вышэй ужо нельга, а моцны стымул для новых перамог», — дзеліцца ўражаннямі дзяўчына.

У скарбонцы ўзнагарод Полесавай шмат пацвярджэнняў яе прафесійнага майстэрства, сярод апошніх — «серабро» ў намінацыі «Кухарская справа» Размеркаванага Еўразійскага чэмпіянату 2022 года, наперадзе — удзел у чэмпіянатах World Skills і «ПрадЭкспа». Агеньчык натхнення ў вачах маладога майстра вытворчага навучання запэўнівае, што далей будзе толькі лепш.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,**
**Фота БелТА.**

Надвор'е

# Дажджы. Цяпло — слабее

## У пятніцу і суботу апошнія цёплыя дзянькі?

**На жаль, сёлетні верасень аказаўся скупы на цяпло і сонца. Такая «змрочная» тэндэнцыя працягнецца і ў першыя дні кастрычніка, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У апошні дзень верасня ўмовы надвор'я будуць вызначаць вобласць паніжанага атмасфернага ціску і франтальныя раздзелы, якія ідуць з паўднёвага захаду Еўропы. Днём у паўднёва-заходніх раёнах краіны пройдуць дажджы. Максімальная тэмпература паветра складзе плюс 13—19 градусаў.

У суботу, 1 кастрычніка, на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы рознай інтэнсіўнасці, уначы ў асобных раёнах краіны дажджы будуць дасягаць крытэрыяў моцных. Месцамі слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 5 градусаў па поўначы да плюс 13 па паўднёвым усходзе. Днём чакаецца 9—16 цяпла, а ў паўднёва-ўсходніх раёнах — да плюс 18 градусаў.

У нядзелю на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы. Месцамі слабы туман. Уначы тэмпература паветра складзе плюс 5—12 градусаў, удзень — 9—15 цяпла. І ў панядзелак часам будуць дажджы. Тэмпература паветра ўначы — ад 5 цяпла да плюс 11 градусаў. Днём паветра прагрэецца да плюс 8—15 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у аўторак, 4 кастрычніка, уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах будзе згушчацца туман. Тэмпература паветра ноччу складзе плюс 3—9 градусаў, удзень — 7—14 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Новы сезон

# ГЭТА ВАРТА ЎБАЧЫЦЬ!

**Цяпер выбар праграм і праектаў стаў яшчэ больш разнастайным. Шэраг прэм'ер прапаноўвае і рыхтуе для аўдыторыі тэлеканал АНТ у новым тэлевізійным сезоне. Тут абмяркоўваюць падзеі ў краіне і свеце, шукаюць таленты і паляпшаюць настрой усім.**



Калі вас цікавяць палітыка, эканоміка і іншыя тэмы, якія не сыходзяць са стужак навін, можна звярнуць увагу на адметныя рубрыкі і праекты. Так, у рубрыцы «Лаўроў. За мяжой» заўсёды знойдзецца свежая порцыя міжнародных навін, разбаўленая гумарам, іроніяй, разборам палётаў і не толькі ад журналіста-міжнародніка Глеба Лаўрова. А вось праект «Усё зразумела з Марынай Караман» дазваляе разам з яго вядучай разабрацца ў рэсурсах нашых і чужых кішэняў»...

— Частка праектаў ужо запушчана, а іншыя яшчэ ў рабоце. Мы плануем сумясціць тое, што часам здаецца несумяшчальным. Напрыклад, тэлебачанне і інтэрнэт. Ёсць у нас задумка аб'яднаць гэтыя платформы і падаць іх па-новаму. Будзе больш і дакументальных фільмаў, — распавёў у эфіры праграмы «Наша раніца» **дырэктар дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання АНТ Анатоль ЗАНКОВІЧ.**

Праект «Зорны шлях» стане новай старонкай у гісторыі забаўляльнага кантэнту АНТ. Цяпер праходзяць кастынгі сярод ахвотных заявіць пра сябе ў шоу. Журы праекта наведаліся ўжо ў Брэст, Віцебск, Магілёў, Гродна, Гомель, дзе праслухалі сотні прэтэндэнтаў самых розных прафесій, але з адным жаданнем — трапіць на сцэну. Таму чакайце і рыхтуйцеся назіраць за «Зорным шляхам» беларусаў на сваіх тэлеэкранах.



Таксама гэтай восенню ў эфіры тэлеканала АНТ убачым спаборніцтва Міжнароднай лігі КВЗ. Заяўлены 26 камандаў, сярод іх дзве будзе з Беларусі. У эфіры гульню тэлеаўдыторыя ўбачыць у канцы кастрычніка — пачатку лістапада. Гумар, інтэлектуальнасць і сапраўдныя эмоцыі — тое, што варта ўбачыць.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ

(«Звязда»)

Выпуск № 175

24 верасня адбыліся чэмпіянаты Беларусі па бліцы ў шашках-100. Пераможцамі майстры спорту Георгій Выдзерка ў мужчын і Марыя Часнакова ў жанчын. У Бярозе 17-18.09.22. адбыўся XI рэспубліканскі турнір па падлогавых шашках. У турніры ўзялі ўдзел 60 шашыстаў. Перамог майстар спорту Валерый Разаеў (Мар'іна Горка).

№ 133



№ 133

**Белыя простыя:** c3, e5, g5, b6, f6, e7 (6)

**Чорныя простыя:** a3, e3, g3, d4, h4, a7 (6)

№ 134

**Белыя простыя:** a1, b2, b4, g5, h6 (5)

**Чорныя простыя:** d4, a5, d6, a7, h8 (5)

№ 135

**Белыя простыя:** a1, g1, b4, g5, h6 (5)

**Чорныя простыя:** d2, g3, a5, e5, d6, h8 (6)

№ 136

**Белыя простыя:** 37, 38, 27, 29, 30, 25 (6)

**Чорныя простыя:** 33, 19, 14, 7, 8, 9 (6)

№ 137

**Белыя простыя:** 47, 50, 41, 24, 19, 7 (6)

**Чорныя простыя:** 37, 38, 32, 35, 30, 17, 18 (7)

Мініяцюры №№ 133—137 складзеныя вядучым аддзела.

Дзве наступныя пазіцыі даслаў Юрый Мурадаў (Барысаў).

№ 138

**Белыя простыя:** a3, b2, b6, e3, f2, g5 (6)

**Чорныя простыя:** b8, d6, d8, f4, f8, g7, h2 (7)

№ 139

**Белыя простыя:** b4, c1, d2, g1, h2 (5)

**Чорныя простыя:** b6, c3, d6, e5, e7, g7, h4 (7)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 174 ад 16.09.22.

№ 129. 1. e7-d8 c5:e7 2. d8:c1 a3:c5 3. c1:e7 f8:d6 4. h6:e3 f2:d4 5. h2-g3 h4:f2 6. g1:a7+

№ 130. Калі белыя згуляюць: 1. g3-f4 e5:g3 2. h2:f8, чорным нельга гуляць: 2...b6-c5? 3. f8:b4 a5:a1 4. f2-g3 h4:d4 5. d2-c3 d4:b2 6. e1-f2 f6-e5 7. f2-e3 x. Чорныя павінны гуляць: 2... h4-g3! 3. f2:h4 і потым: 3...b6-c5! 4. f8:b4 a5:a1 5. e3-f4 a1-d4 6. f4-g5 d4-c5 7. g5:e7 c5:f8 8. h4-g5 f8-g7 9. d2-e3 g7-h8 10. g5-h6 h8-f6 11. e1-d2 f6-h8 12. e3-d4 h8:e1 13. h6-g7 =. Да перамогі вядзе 1. b2-c3+

№ 131. 1. c5-d6 e7:e3 2. d2:d6 b4:d2 3. c1:g1 f6-g5 4. d6-c7 g5-f4 5. c7-b8 f4-e3 6. g1-f2 e3:g1 7. b8-a7 a5-b4 8. a3:c5 g1:b6 9. a7:g1+

№ 132. 1. e1-d2 c3:g3 2. c1-d2 a3:c5 3. f6:b6 h8:f6 4. b6-c7 d8:b6 5. a7:e3 g3-f2 6. e3:g1 b8-a7 7. h2-g3 h4:f2 8. g1:e3 a7-b6 9. e3-d4 b6-a5 10. d4-c5+

Першымі дакладныя адказы даслалі: Л. Трафімчык (Іўе), А. і А. Высоцкія (г. Капыль), С. Рашэцін (Ашмяны), С. Бурко (Орша), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), У. В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), У. Ваўчкоў (Маладзечна).

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013,*

*e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

Сядзі і глядзі

# СВЯТОЧНЫЯ АКЦЭНТЫ Ў ЭФІРЫ

**Адразу двух знакамітых творцаў згадаюць у іх дзень нараджэння на сацыякультурным тэлеканале. Бо 1 кастрычніка споўніцца 95 гадоў з дня нараджэння акцёра, народнага артыста СССР Алега Яфрэмава і 85 гадоў — кампазітара, педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР, народнага артыста Беларусі Андрэя Мдзівані.**



Пра асобу Алега Яфрэмава (1927—2000) згадаем падчас прагляду аўтарскай праграмы «Люблю і памятаю» Уладзіміра Арлова. Аўтар меў магчымасць кантактаваць з Алегам Мікалаевічам у той перыяд, калі адбывалася «ломка біяграфіі і лёсу» вялікага творцы. Тады ён пераходзіў з пасады мастацкага кіраўніка тэатра «Сучаснік» у Маскоўскі мастацкі акадэмічны тэатр. Як тое адбывалася, чым суправаджалася і як пісаліся новыя старонкі гісторыі жыцця вялікага Яфрэмава, распавядае Уладзімір Арлоў, абапіраючыся на свае ўспаміны і ўражанні ад знаёмства і гутарак з артыстам. Вялікі акцёрскі талент, глыбіня асобы — усё гэта засталося ў памяці сучаснікаў Алега Мікалаевіча. І, пераглядаючы яго фільмы, кожны і сёння можа ў тым пераканацца.

Таму адразу пасля заканчэння праграмы не прапусціце паказ мастацкага фільма «Сачыненне да Дня Перамогі» (1998 г.) рэжысёра Сяргея Урсуляка, у якім Алег Яфрэмаў зняўся ў галоўнай ролі. За кадрам усё, што адбываецца, каментуе маленькая дзяўчынка — праўнучка галоўных герояў (з блізкай будучыні). ...Напярэдадні Парада Перамогі ў міліцыю трапляе ветэран Вялікай Айчыннай вайны Іван Дзьякаў (на вайне ён быў камандзірам экіпажа самалёта). А яго былы штурман Дзмітрый Кілаватаў, які стаў уплывовым чалавекам ва ўладзе, выратоўвае баявога таварыша з СІЗА і паведамляе яму, што хутка на маскоўскім аэрадроме прызямліцца трэці член экіпажа — стралок Лёўка Маргуліс. Сустрэўшы колішняга паплечніка (ён страціў зрок), Дзьякаў вязе яго да сябе дадому. Там сябры ўспамінаюць мінулае, спрачаюцца, абмяркоўваюць вострыя тэмы сучаснасці, і ўсё быццам бы наладжваецца. Аднак нечакана арыштоўваюць Кілаватава — за махінацыі ў яго дабрачынным фондзе, да якіх той не мае ніякага дачынення. Тады франтавікі, каб вызваліць свайго сябра, пранікаюць на аэрадром і захопліваюць самалёт Іл-86, які накіроўваецца па міжнародным рэйсе... Дарэчы, яшчэ адзін фільм з удзелам Алега Яфрэмава — «Тры таполі на Плюшчысе» пакажуць у суботу на канале «Культура».

А на «Беларусь 3» у гэты дзень таксама распавядуць пра кампазітара Андрэя Мдзівані (1937—2021) у праграме «Кампазітары Беларусі». Стваральнікі праекта малююць партрэт легендарнага творцы, складаючы яго з фрагментаў твораў кампазітара, успамінаў пра гэтага чалавека яго паплечнікаў і паслядоўнікаў. Ён нарадзіўся ў сонечным Тбілісі, а ў Беларусі рэалізаваў свой талент... Тое, што хлопчык мае інтарэс да музыкі, заўважылі рана, таму і аддалі яго ў музычную школу па класе скрыпкі і фартэпіяна... Пройдуць гады, і Андрэй Мдзівані стане легендай беларускай музыкі, здабудзе міжнароднае прызнанне і пакіне багатую спадчыну са сваіх твораў. Аднак ці ўсё так проста складвалася, хто спрыяў яго творчай рэалізацыі і чаму варта звяртацца да музыкі выдатнага кампазітара — пра гэта і не толькі распавядае праект «Кампазітары Беларусі».

Яшчэ адной святочнай нотай у эфіры сацыякультурнага тэлеканала стане канцэрт да Дня настаўніка, паказ якога плануецца ў нядзелю, 2 кастрычніка, днём.

**Алена ДРАПКО.**

## «Цёплая восень са «Звяздой»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або II паўгоддзе 2022 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 21 кастрычніка 2022 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.





Сярод падпісчыкаў 27 кастрычніка 2022 года будуць разыграны 7 кропельных кававарак Holt HT-CM-005 і суперпрыз — маслены радыятар Timberg TOR 21 1507BC. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 2 лістапада 2022 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 снежня 2022 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2022 г. і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Цёплая восень са «Звяздой» чытайце ў нумары 164 газеты «Звязда» ад 23.08.2022 года.

**Тэлефон для даведак (017) 271 81 53.**

**Тэрмін правядзення гульні — з 1.09.2022 да 31.12.2022.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4223 ад 17.08.2022 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

## Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або на II паўгоддзе 2022 года

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______________________

______________________

**Падпіска афармлена і аплачана ў** ______________________

*(аддзяленне сувязі)*

______ **на IV квартал або на II паўгоддзе 2022 года**

**Хатні адрас і тэлефон** *(абавязкова)* [ ] *(індэкс)* ______

______________________

______________________

Удачы ў розыгрышы!

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 23.55** Зона Х (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.40** Навіны надвор'я.
**11.00, 12.15 Драма «Родныя душы» (12+).**
**13.05, 15.25 Драма «Уваходзьце, зачынена!» (12+)**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.35, 19.20 Драма «Месца пад сонцам» (16+).**
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**22.00 Серыял «След» (16+).**
**23.40** Арэна.
**0.15** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 14.45, 22.35** Тэлебарометр.
**10.05** «Новы дзень» (12+).
**10.35** «На тыдзень» (16+).
**11.20 Серыял «Забытае завяшчанне» (16+).**
**15.20** Анімацыйны серыял «Качыныя гісторыі» (0+).
**16.05** «Урфін Джус вяртаецца» (6+).
**17.20 Серыял «Акваторыя» (16+).**
**18.55 Серыял «Сляпая» (16+).**
**19.25** «Цуд». Дак. драма (16+).
**19.55** «Тры першыя спатканні» (16+).
**20.40, 21.15 Серыял «Практыка» (12+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**22.40 «Гаспадыня лёсу». Серыял (16+).**
**23.40** «На кручку» (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.05, 15.20, 20.30, 23.35** Навіны культуры.
**8.15 «Жандар на прагулцы». Маст. фільм (12+).**
**9.55** «Нацыянальны хіт-парад».
